**Есіс Я. В. (Мінск)**

## Электронныя адукацыйныя рэсурсы як кампанент адукацыйнага працэсу па беларускай літаратуры

Сучаснае інфармацыйнае грамадства патрабуе ад удзельнікаў адукацыйнага працэсу пошуку новых шляхоў атрымання і засваення ведаў, бо традыцыйныя вучэбныя выданні па беларускай літаратуры ўтрымліваюць інфармацыю пераважна ў тэкставым выглядзе і суправаджаюцца нешматлікім ілюстрацыйным матэрыялам. У сувязі з гэтым узнікае задача змянення традыцыйных мадэлей арганізацыі навучання, карэкціроўкі яго зместу, структуры падачы настаўнікам вучэбнага матэрыялу ва ўрочнай і пазаўрочнай сістэме літаратурнай адукацыі. Вырашэннем названай праблемы становіцца выкарыстанне ў навучанні беларускай літаратуры электронных адукацыйных рэсурсаў (ЭАР).

Рэалізацыі зместу вучэбнай дысцыпліны ў межах вучэбна-метадычных комплексаў інфармацыйнага забеспячэння ў методыцы прысвечаны працы У.П. Беспалька, А.Я. Вайскунскага, Я.С. Полата, Н.Ф. Тылызінай, М.І. Бяляева, Г.А. Красновай, І.Ю. Кудзінай і іншых.

ЭАР у сучасным адукацыйным асяроддзі – гэта электронны вучэбна-метадычны комплекс (ЭВМК), які ўяўляе «сукупнасць структураваных метадычных матэрыялаў, аб’яднаных сродкамі камп’ютарнага асяроддзя, якое забяспечвае поўны дыдактычны цыкл навучання» [1, с. 10]. У сваю чаргу пад паняццем ‘структураваны’ разумеюцца паняцці сістэмнасці, паэтапнасці, даступнасці. Асноўным кампанентам выкарыстання ЭАР на ўроках беларускай літаратуры з’яўляецца наяўнасць камп’ютранай прасторы, якая патрабуе наяўнасці матэрыяльна-тэхнічных, арганізацыйных і інфармацыйна-камунікатыўных умоў, што спрыяюць лепшаму развіццю пазнавальнай актыўнасці вучняў.

Па структуры ЭАР могуць быць прадстаўлены ў выглядзе асобных лагічна ўзаемазвязаных элементаў або модуляў, якія маюць асобныя блокі як для настаўніка, так і для вучняў, якія, у сваю чаргу, падзяляюцца на раздзелы, арыентаваныя на вучэбную праграму.

ЭАР па беларускай літаратуры як вучэбна-метадычны комплекс павінен быць створаны на высокім навукова-метадычным і тэхнічным узроўнях і поўнасцю адпавядаць патрабаванням наступных дакументаў: «Адукацыйны стандарт вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» (I–XI класы)», «Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура»»», вучэбнай праграме «Беларуская літаратура».

Аднак у адрозненні ад друкаваных ВМК ЭАР маюць прынцыповыя адрозненні, якія на думку Т. М. Шалкінай, В. В. Запарожка, А. А. Рычковай [1, с. 11] заключаюцца ў:

*інтэрактыўнасці – магчымасць ЭАР рэагаваць на патрабаванні вучняў, ствараючы пры гэтым умоўны літаратурны дыялог «камп'ютар – настаўнік – вучань – камп'ютар»;

*актуалізацыі – магчымасць своечасовага абнаўлення і дапаўнення вывучаемага дыдактычна-метадычнага матэрыялу;

*інтэграцыі – магчымасць далучэння ў склад ЭАР ссылак на іншыя электронныя крыніцы інфармацыі (электронныя адрасы, пошукавыя сістэмы, парталы бібліятэк і г.д.);

*адаптацыі – магчымасць ЭАР арыентавацца на ўзроства-індывідуальныя асаблівасці і здольнасці вучняў, зацікаўленых ў атрыманні больш поўных і грунтоўных ведаў пры вывучэнні беларускай літаратуры праз разнастайныя формы кантролю і арганізацыі самаадукацыі;

*візуалізацыі – магчымасць выкарыстоўваць графічныя і ілюстрацыйныя матэрыялы, фрагменты або поўны варыянты аўдыё- і відэаматэрыялаў (музычныя творы, дакументальныя і мастацкія стужкі).

ЭАР як элемент ВМК павінен адпавядаць традыцыйным дыдактычна-метадычным прынцыпам [1, с. 11-12]:

*навуковасці – дастатковая глыбіня вывучаемага матэрыялу, арыентаванага на традыцыі, заснаваныя беларускім літаратуразнаўствам;

*даступнасці – суадноснасць тэарэтычна-абгрунтаванага аспекту вывучаемага літаратурна-тэарэтычнага і крытычна-метадычнага матэрыялаў згодна з ўзроства-індывідуальнымі асаблівасцямі вучняў (V–XI класы);

*нагляднасці – улік пачуццёвага ўспрымання вывучаемых тэм, дэманстрацыя гукавых ці відэафрагметаў, ілюстрацыйна-графічных матэрыялаў;

*сістэмнасці і паслядоўнасці – лагічнае засваенне вучнямі літаратурных персаналій, тэндэнцый развіцця згодна вучэбнай праграмы.

*свядомай актыўнасці – актывізацыя вучнёўскай творча-пошукавай дзейнасці па вывучэнні інфармацыі для поўнага разуменні выніковых мэт і задач канкрэтнага ўрока, прысвечанага пэўнай літаратурнай персаналіі або працэсу;

Пры ўвядзенні і адукацыйны працэс па беларускай літаратуры ЭАР будуць ажыццяўляцца такія віды вучэбнай дзейнасці вучняў, як:

*актывізацыя дзейнасці вучняў – скіраванасць на развіццё літаратурна-творчых здольнасцей вучняў, іх маўленчай культуры, даследчай скіраванасці;

*літаратурная палітра – развіццё разумення эстэтычнага ўспрымання мастацкага твора як цэласнасці ў адзінстве формы і зместу, успрымання літаратурнага твора ў сістэме творчасці пісьменніка ў суадносінах з развіццём літаратуры і эпохай яго стварэння;

*інфармацыйнасць – папаўненне і абнаўленне новага вучэбна-метадычнага матэрыялу, якія адпавядаюць ўзроставаму развіццю вучняў;

*аптымізаванасць вучэбнага працэсу – арыентацыя вучня на паспяховае дасягненне вучэбных мэт праз супастаўленне агульных і адметных рыс літаратурнага твора і іншых відаў мастацтва праз аптымальныя сродкі іх адлюстравання (вучэбна-метадычнае забеспячэнне, выкарыстанне інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій і г.д.);

*індывідуалізацыя – ЭАР павінен даць магчымасць выбару вучням спосабу ўласных шляхоў паспяховага засваення ведаў для ўспрымання літаратуры як сінтэтычнага віду мастацтва.

Працэс вывучэння навейшай беларускай літаратуры павінен пачынаецца з сістэмнай працы настаўніка над планаваннем і пастаноўкай задач, якія патрабуюць сістэмнага падыходу да праектавання вучнёўскай дзейнасці. Гэта пашырае эфектыўнасць навучання ў межах невялікай колькасці вучэбных гадзін, адведзеных вучэбнай праграмай на раздзелы «Сучасная беларуская проза», «Сучасная беларуская паэзія», «Сучасная беларуская драматургія» [2].

Настаўніку на ўроках беларускай літаратуры варта скіраваць сваю ўвагу на адбор зместу навучання праз ЭАР, якія становяцца варыянтамі для замацавання асноў тэзіснага канспектавання, вылучэння галоўнага праз самастойную пабудову лагічных схем пры вывучэнні навейшай беларускай літаратуры. Гэта адзін са спосабаў аптымізацыі навучання беларускай літаратуры, скіраваны на паглыбленне адукацыйна-выхаваўчага і індывідуальнага развіцця вучняў.

Выдзяленне галоўнага, каардынацыя і рацыянальнае структурыраванне вучэбнага матэрыялу з выкарыстаннем ЭАР павышае

ўзровень даступнасці вывучаемага матэрыялу, вядзе да яго аптымальнага асэнсавання і ўсведамлення вучнямі. Важным становіцца выяўленне актыўных (вядучых) метадаў, якія дазваляюць паспяхова вырашаць пастаўленыя задачы праз здзяйсненне выбару шляхам самастойнага вывучэння рэкамендаванай літаратуры па сучаснай беларускай літаратуры, засяроджваючы ўвагу на спецыфіку літаратурна-крытычных матэрыялаў і яго зместу, актывізацыю пазнавальнай дзейнасці вучняў, літаратурнае кола зацікаўленасці настаўніка.

Важным з'яўляецца выбар правільнага метаду павышэння матывацыі навучання ў школьнікаў праз такія формы правядзення ўрокаў, як пазнавальныя гульні (вывучэнне драматургіі С. Кавалёва [2]), вучэбныя дыскусіі (вывучэнне прозы В. Карамазава, паэзіі Р. Баравіковай [2]), «эмацыйныя хваляванні» (вывучэнне аповесцей І. Пташнікава, В. Казько, драматургіі А. Дударава і А. Петрашкевіча, паэзіі Я. Сіпакова і В. Зуёнка» [2]), стварэння сітуацыі пазнавальнай навізны (тэмы «Урбаністычныя матывы ў сучаснай паэзіі», «Чарнобыль у паэтычным святле сучаснай лірыкі», «Маральна-філасофскі змест ў сучаснай прозе», «Тэма гістарычнага мінулага ў творах сучаснай беларускай прозы», «Традыцыі Уладзіміра Караткевіча і Андрэя Макаёнка ў рэчышчы сучаснай беларускай драматургіі» [2]), выкарыстоўваючы пры гэтым ЭАР, прымяненне якіх вядзе да працэсу аптымізацыі праз эканомію часу на занятках.

Пры выкарыстанні ЭАР як сродку аптымізацыі працэсу па беларускай літаратуры больш якасна настаўніку неабходна ўмець аператыўна рэагаваць і карэкціраваць вучэбны працэс: пры наяўнасці цяжкасцей вывучэння новага матэрыялу хутка змяняць формы і віды работы вучняў. Таму навучанне павінна быць скіравана на аналіз вынікаў актыўнай дзейнасці з Улікам затрачанага часу і з кропкі гледжання суадноснасці дасягнутым вынікам у рэчышчы акрэсленых літаратурных задач.

Асваенне настаўнікам навыкаў працы з ЭАР і ўвядзенне яго ў вучэбны працэс павінна адбывацца паэтапна, з паступовым павелічэннем ступені самастойнай работы вучняў. Падобная работа дазваляе першаму сфарміраваць у другіх уласны літаратурна-крытычны светапогляд, грунтоўныя і трывалыя веды, развіваць мысленне, пазнавальную актыўнасць. Такое навучанне скіравана на выяўленне сутнасці вывучаемых літаратурных персаналій, з'яў і працэсаў, адкрыццё і сістэматызацыю новых ведаў, пошук заканамернасцей, апісанне, праектаванне. Зразумела, што правільна ажыццявіць працэс выкарыстання ЭАР вучнямі можа толькі зацікаўлены ў гэтым настаўнік,

які з’яўляецца рэгулятарам і стварае ўмовы для развіцця творчага патэнцыялу асобы, яе самавызначэння і самарэалізацыі.

Такім чынам, выкарыстанне ЭАР як элемента вучэбна-метадычнага комплексу ў адукацыйным працэсе па беларускай літаратуры дазваляюць актывізаваць пазнавальную дзейнасць вучняў, дасягнуць больш якаснага засваення вывучаемага матэрыялу, бачыць якасць сфарміраваных ведаў, уменняў і навыкаў, ажыццяўляць дыферэнцыраваны падыход у працэс развіцця навыкаў творча-пошукавай дзейнасці.

1. Шалкіна Т. М. Электронныя вучэбна-метадычныя комплексы: праектаванне, дызайн, інтрументальныя сродкі / Т. М. Шалкіна, В. В. Запарожка, А.А.Рычкова. – Арэнбург: ДУА АДУ, 2008. – 160 с.
2. Беларуская літаратура. V–XI класы: вучэбная праграма для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. – Мінск: НІА, 2012.